супярэчыць народным канонам жыцця. Аўтары высмейваюць паноў і чыноўнікаў. Смех выконвае тут сваё грамадскае прызначэнне – дапамагае сцвярджэнню годнасці і самакаштоўнасці кожнага чалавека, якога б паходжання ён ні быў.

Дзякуючы свайму арыгінальнаму зместу, арыентаванаму на мясцовае жыццё і нацыянальны каларыт, багацце мовы і народнай культуры, «Энеіда» В.П. Равінскага, як і твор І.П. Катлярэўскага, адыгралі важную ролю ў станаўленні новых украінскай і беларускай літаратур, сталі прадвеснікамі іх далейшага развіцця і высокіх мастацкіх здабыткаў.

**Літаратура**

1. Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў. У 2 т. / Нац. Акад.навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. тома У.І. Мархель, В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – Т. 2. Новая літаратура : другая палова XVIII–XIX стагоддзяў. – 582 с.

2. Кісялёў, Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. / Г.В. Кісялёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 397 с.

3. Кісялёў, Г. В. Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» / Г.В. Кісялёў. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 549 с.

4. Садаўнічы, Э. Паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», іх месца ў новабеларускай літаратуры / Э. Садаўнічы // Роднае слова. – 1998. – №10. – С. 21–29.

5. Энеіда навыварат; Тарас на Парнасе. – Мінск : Юнацтва, 1983. – 62 с.

*Т. М. Тарасава (Мінск)*

## ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНЫ ЧАЛАВЕК І САЦЫЯЛЬНЫЯ МЕХАНІЗМЫ ГРАМАДСТВА Ў ЛІТАРАТУРЫ XX СТ. (А. МРЫЙ, А. ПЛАТОНАЎ, ДЖ. ОРУЭЛ)

Экзістэнцыяльнае і сацыяльнае, асоба і калектыў, асоба і грамадства – таямніцу іх узаемаадносін спрадвеку спрабуе асэнсаваць і філасофская думка, і прыгожае пісьменства. Канцэпцыя ўзаемастасункаў сацыяльнага і экзістэнцыяльнага знайшла распрацоўку ў працах Э. Гусэрля, М. Хайдэгера, М. Бярдзяева, Л. Шастова, Э. Фрома, Ж.-П. Сартра, А. Камю і іншых філосафаў найноўшага часу.

Да разважанняў філосафаў па праблемах узаемастасункаў экзістэнцыяльнага і сацыяльнага далучылася і прыгожае пісьменства. Разгадванню таямніцы чалавека ў сацыяльных умовах XX ст. прысвяцілі свае творы многія вядомыя пісьменнікі («Мы» Я. Замяціна, «Замак» Ф. Кафкі, «О чароўны новы свет» О. Хакслі, «Гульні сучаснікаў» Кэндзабура Оэ, «Вайна канца свету» М.В. Льоса, «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел» В. Казько, «451˚ па Фарынгейту» Р. Брэдберы, «Элементарныя часціцы» М. Уэльбека). Нельга не прыгадаць імёны і А. Мрыя, А. Платонава, Дж. Оруэла. Мары аб ідэальным грамадстве, уласцівыя чалавеку спрадвеку, аказаліся канчаткова разбураны сітуацыяй сённяшняга свету. Пачуццё крызісу традыцыйных маральна-этычных норм у XX ст. набыло ўсеагульны характар. Буйныя

мастакі-філосафы адчулі дух эпохі як мяжу, пераход, пачатак нечага незразумела новага і ўвасобілі яго ў шматлікіх формах; найбольш прыкметнай стала антыутапічная тэндэнцыя, напоўненая глыбокімі разважаннямі над сацыяльнымі эксперыментамі мінулага стагоддзя. Яна набыла устойлівы характар і росквіт яе быў выкліканы *індывідуалізаваным* падыходам да чалавека і яго праблем у грамадстве.

Мы не ставім перад сабой задачу каталагізаваць формулы антыутапічнага жанру, хоць гэты перспектыўны накірунак даследавання застаецца яшчэ малавывучаным. Для нас важным з'яўляецца маральна-этычны патэнцыял антыутапічнага светабачання А. Мрыя («Запіскі Самсона Самасуя»), А. Платонава («Катлаван», «Чэвенгур»), Дж. Оруэла («1984»), скіраваны на асэнсаванне ўзаемастасункаў экзістэнцыяльнага і сацыяльнага і пераадолення пасткі паміж індывідам і грамадствам.

Ідэя сусветнага раю на зямлі заўсёды моцна сядзела ў народнай свядомасці, а рэвалюцыі толькі падагравалі яе і пераводзілі з разраду абстрактных мар у дасягальную рэчаіснасць. Беларускі пісьменнік А. Мрый у фарсавай манеры праілюстраваў ідэю «зямнога раю» ў асобным мястэчку Шапялёўка. Камсамолец Дусік заяўляе: «Перад намі сонца, паветра, вада, а мы не ўзялі іх на рэмус, не прыцягнулі да адказнасці. Няхай яны працуюць нам, як мы працавалі панам!» [1, с. 88]. У горадзе Чэвенгур, павятовай глушы, «працавала» адно толькі сонца, аб'яўленае «сусветным пралетарыем», а двары, яблыневыя сады парасці пустазеллем (А. Платонаў «Чэвенгур»).

Чэвенгур, Шапялёўка – будаўнічыя пляцоўкі новай рэальнасці, для ажыццяўлення якой, па словах Чапурнага, трэба толькі «класс остаточной сволочи» ліквідаваць. Чэвенгур і Шапялёўка – гэта яшчэ і новы спосаб зносін паміж людзьмі. Так званыя «будаўнікі зямнога раю» А. Мрыя і А. Платонава пазбаўлены пакутлівай духоўнай працы. У Чэвенгуры выдалена сама здольнасць чалавека мысліць. Жыхары толькі праз эмоцыі могуць спасцігаць свет. І горад як прыклад «зямнога раю» гіне не па віне нейкіх варожых сіл. Прычыны трэба шукаць у самім грамадстве, дзеля будучыні якога патрэбна жыццё «всех жителей, чтобы не пришлось им потом помирать на переходных ступенях». У горадзе засталося толькі адзінаццаць чалавек, астатнія расстраляны (Піюся адправіў іх абсталёўваць неба для вечнага шчасця). Святло ў будынках пагасла, бо «жизнь отрешилась от этого места и ушла умирать в степной бурьян» [2, с. 227], – канстатуе Платонаў.

Загадчык аддзела культуры Самсон Самасуй, мястэчковыя настаўнікі, паэт Гарачы (Пушкінзон) – асобы, якія па сутнасці сваёй павінны быць ахоўнікамі асноў цывілізацыі, аказваюцца нікчэмнымі людзьмі, духоўна беднымі, маральна нячыстымі. Мастацтва ў рамане А. Мрыя (паэмы Пушкінзона, скандальная п'еса мясцовага аматарскага тэатра, любімыя рамансы Самасуя) перастае быць спосабам выяўлення духоўнай культуры асобы, яно набывае пачварныя формы і заглушае голас унікальнай чалавечай душы. У рамане Дж. Оруэла «1984» кнігі пераводзяць у «новаяз» і тым самым назаўсёды разбураюць іх духоўны кампанент, каб прасцей было падпарадкоўваць свядомасць людзей афіцыйнай ідэалогіі.

Розум новых інтэлігентаў А. Мрыя, А. Платонава не мае ніякіх маральна-этычных абмежаванняў, яны энергічныя, амаль аскеты ў бытавых умовах, гэта людзі без мінулага і без абавязкаў. Самсон Самасуй, Пашынцаў, Чалурны – пераўтваральнікі свету, апантаныя ідэяй прымусіць служыць сілы прыроды чалавеку, але самая галоўная іх мэта – перарабіць асобу. Неўтаймаваная энергія гэтых герояў-пераробшчыкаў здольная, здаецца, іх фантазію зрабіць рэчаіснасцю. Перашкод на сваім шляху яны не бачаць, бо іх светапоглядныя пазіцыі супадаюць з генеральнай лініяй улады. Старшыня РВК т. Сом гаворыць пра Самасуя: «Такія людзі нам патрэбны. Часам дзірку якую заткнуць» [1, с. 111]. Капенкін з «Чэвенгура» кульгавага ўпаўнаважанага рэвалюцыйнага камітэта называе «затычкай» («... ты здесь всем текущим событиям затычка, – поддерживал Копенкин достоинство Достоевского» [2, с. 108–109]). Запатрабаванасць уладай нараджала неабмежаваную свабоду духу неабцяжараных мараллю людзей. Тэндэнцыя набывала агульнадзяржаўны маштаб і станавілася з'явай небяспечнай. Мастацкая літаратура добра ўсведамляла яе філасофскі абсурд.

Маральны выбар чалавека па прыродзе сваёй заўсёды трагічны, трагічны ён і для асобы Самсона Самасуя. Сам ён гэтага не заўважае, але ўся яго істота прасякнута фальшывасцю: гэта і несапраўднасць чалавечых зносін, і абсурднасць дзеяння, і хлусня самому сабе. Імкненне да поўнай экзістэнцыяльнай свабоды пры ігнараванні маралі і адсутнасці розуму штурхае героя А. Мрыя на шлях індывідуалісцкага «своеволия». Прага эгаістычнага самасцвярджэння пераважыла нормы прыстойнасці, маралі, законы логікі і прымусіла авантурыста стаць на пазіцыю: «Пройдзе ўсё, а я застанусяў» [1, с. 77].

Трыумф бязглуздых ідэй галоўнага героя рамана А. Мрыя ставіць крыж на спрадвечных маральных каштоўнасцях, на традыцыйных прынцыпах светабудовы, што з цягам часу будзе вельмі небяспечным для чалавека. Новыя формы быцця, вынаходніцкія мадэлі светаўладкавання, на думку пісьменнікаў, аказваюцца нікчэмнымі, калі яны пазбаўлены маральна-этычных нормаў. Расплата за утопію, за ілюзіі, як паказала гісторыя XX ст., фантастычна высокая і не можа быць апраўдана ніякімі сродкамі.

Пры ўсім трагізме гістарычных зломаў яны, як гэта ні парадаксальна, нясуць у сабе і пазітыўны момант, бо выяўляюць сапраўдную сутнасць чалавека як істоты, *адказнай перад гісторыяй*. Сацыяльныя эксперыменты над трансфарміраваннем чалавечага духу небяспечныя, і Аляксандр Дванаў, самы блізкі Платонаву герой, сведчыць: «Здесь ... не механизм лежит, здесь люди живут, их не наладишь, пока они сами не устроятся. Я раньше думал, что революция – паровоз, а теперь вижу, нет» [2, с. 300]. Праблематыка «Запісак Самсона Самасуя», «Катлавана», «Чэвенгура» апярэджвала свой час і аказалася дастаткова універсальнай, каб выявіць сутнасць многіх змрочных феноменаў XX ст.: сталінскі казарменны сацыялізм, фашызм, камбаджыйскі і чарнобыльскі генацыд, кітайская культурная рэвалюцыя.

Створаны А. Мрыем і А. Платонавым вобраз несвабоднага грамадства і яго ўздзеянне на асобу свайго кульмінацыйнага развіцця дасягнуў у ра-

мане англійскага пісьменніка Дж. Оруэла «1984». Характэрныя рысы грамадства Акіяніі можна вызначыць па яго адносінах да экзістэнцыяльнай сутнасці чалавека. Дзейнасць улады ў рамане Дж. Оруэла скіравана на ліквідацыю калектыўнай памяці, на кантроль над мінулым і кіраванне часам, на татальную пераробку чалавека. Міністэрства праўды занята тым, што перапісвае гісторыю. «Новым» грамадствам дзеля загартоўкі сваіх членаў, пазбаўлення метафізічнага смутку і самазаглыблення праводзіцца масавае, калектыўнае радзенне: суботнікі, сонечная кампанія, сялянскія сходы, калектыўныя нарады ў Мрыя і Платонава, «оргіі адзінства», «хвілінкі нянавісці» ў Оруэла. «Старэйшы брат» Оруэла называе такі сацыяльны парадак зямным раем, у імя якога варта ахвяраваць асабістай свабодай і шчасцем. Сэнс новага светаўладкавання выдатна сфармуляваў машыніст-настаўнік з рамана Платонава «Чэвенгур»: «Людей много, машин мало» [2, с. 15]; «Человек – чушь!.. Он дома вапяется и ничего не стоит...» [2, с. 33].

У Оруэла паміж грамадзянамі АНГСАЦу дзейнічае «ўнутраная партыя», надзеленая ўладай кантролю над усімі не толькі ў сферы інтымных зносін людзей, але і над іх жыццём: яна ажыццяўляе масавыя палітычныя даносы, рэпрэсіі. Краіна Акіянія жыла па трох партыйных лозунгах: вайна – гэта мір, свабода – гэта рабства, няведанне – сіла. Дзяржава (міністэрства праўды, міністэрства міру, міністэрства любві, міністэрства дастатку) стварыла татальны кантроль над асобай. Паліцыя думак магла ў любы момант падключыцца да тэлеэкрана, які знаходзіўся і на працы, і дома, назірала і падслухоўвала кожны рух і кожнае слова. У полі, у лесе маглі стаяць мікрафоны. Адзіночкі заўсёды выклікалі падазрэнне. Каб ад'ехаць далей чым на 100 км, патрэбен быў штамп у пашпарце. Каханне да жанчыны перастала быць каханнем, а стала «партыйным доўгам» дзеля вытворчасці дзяцей. У Акіяніі забаранялася пісаць лісты, бо яны выяўлялі пачуцці унутранага індывідуальнага «я». Існавалі паштоўкі з гатовымі надрукаванымі фразамі, дзе непатрэбныя словы закрэсліваліся. Людзі ў Оруэла авалодвалі «мастацтвам гаварыць, не шавелячы губамі» [3, с. 95]. Раманы пісалі машыны, вершы – апарат пад назвай «версіфікатар». Партыя прысвоіла сабе права не прызнаваць «праўдзівасць тваіх успрыняццяў і нават само існаванне знешняга свету» [3, с. 68], «в философии, в религии, в этике, в политике дважды два может равняться пяти» [3, с. 137]. Каб звузіць «гарызонты думкі» [3, с. 52] быў прыдуманы «новояз», які трансфармаваў звыклую сістэму мыслення. Герой Оруэла Сайм, працуючы з новаязам, не без гонару сцвярджае: «*Атмосфера* мышления станет иной. Мышления в нашем современном значении вообще не будет. Правоверный не мыслит – не нуждается в мышлении. Правоверность – состояние бессознательное» [3, с. 52].

Утапічная ідэя агульнай роўнасці, дабрабыту патрабавала неадкладнай перабудовы чалавека, да якой найперш прычыніліся ідэолагі ад улады, выпрацаваўшы цэлы механізм формазагатоўкі чалавека. Людзі нізкага інтэлектуальнага ўзроўню рэфармавалі мову, паспешліва фармулявалі абстрактныя ідэі кіравання дзяржавай. У новай сацыяльнай сістэме чалавек пераставаў належаць самому сабе, губляў сваю экзістэнцыяльную са-

масць. Каб пастаянна падтрымліваць такі стан рэчаў, уладзе патрэбен быў рэпрэсіўны апарат. Кандыдат у інквізітары мясцовага маштабу Пракофій Дванаў (А. Платонаў «Чэвенгур») заяўляў: «Организация – умнейшее дело: все себя знают, а никто себя не имеет. <...> При организации можно много лишнего от человека отнять» [2, с. 296]. Вядома, «лишнее» – гэта яго індывідуальнасць, унікальная самасць.

Задача грамадства суцэльнага калектывізму – завалодаць унутраным светам чалавека, адлучыць яго ад маралі, «вырваць з плыні гісторыі», праз страх, тэрор, пагрозы цалкам падпарадкаваць яго свядомасць. У Дж. Оруэла за чалавекам увесь часназіраюць, у Чэвенгуры А. Платонава людзі выступаюць як адна рэч для другой (як тавар), у Мрыя Самасуй жадае ахапіць сваёй дзейнасцю як мага больш людзей. «У нас же все решается по большинству, – заяўляе Капенкін у «Чэвенгуры», – а почти все неграмотные, и выйдет когда-нибудь, что неграмотные постановят отучить грамотных от букв – для всеобщего равенства...» [2, с. 103, 124].

Галоўны кат О'Брайен («1984») – увасабленне дзяржаўнай рэпрэсіўнай машыны, яе вынаходніцкі розум і выканаўца. Ён інтэлектуал і меў у аблічча нешта няўлоўна прывабнае, інтэлігентнае. Катаванне для О'Брайена – адзіны прыдатны метад, каб прынізіць чалавека, пазбавіць яго магчымасцей не згаджацца, разважаць. Вынаходніцтва О'Брайена заключаецца ў тым, што ён шукае такую форму прыніжэння асобы, якой немагчыма супраціўляцца, а для гэтага, як ён лічыць, патрэбна дасканалае вывучэнне чалавека. Невыпадкова і ў пакоі Самсона Самасуя вісіць плакат: «Каб мы ведалі ўсе дробязі жыцця якой-небудзь казюлькі, мы шмат якіх памылак маглі б не зрабіць!» [1, с. 30]. Намеры героя А. Мрыя на практыцы ажыццявіў кат О'Брайен.

Філасафія О'Брайена надзвычай зручная для апраўдання пралікаў і недахопаў улады: «Подлинная наша жизнь – в будущем. <...> Когда наступит это будущее, неведомо никому» [3, с. 124]. Каштоўнасць жа сённяшняга быцця нівеліруецца, жадання надаць вартаснасць цяперашняму дню ў героя няма.

Ступень нівеліравання асобы ў рамане Оруэла дасягнула такіх маштабаў, што герой Уінстан Сміт, служачы міністэрства праўды, не ведае дакладна ні даты свайго нараджэння, ні які год на двары, і для каго ён піша дзённік. Толькі глыбока схаваная ўнутраная неабходнасць у споведзі, патрэба ў прысутнасці суразмоўцы, якому можна даверыць патаемныя ваганні, штурхнула героя на небяспечны крок занатавання сваіх думак. Татальны кантроль з боку дзяржавы не адразу вытруціў у героя схільнасць да самааналізу, тонкага назірання за механізмам уздзеяння масавага псіхозу на ўнутранае «я» асобы. Адзіны спосаб самазахавацца, як лічыць Сміт, не здрадзіць «непразрыстаму «я» (У. Набокаў), захаваць у сабе ерытычную думку.

Такім чынам, праз іронію і скепсіс, матыў катлавана і татальнага абсурду бачыцца песімістычнае стаўленне А. Мрыя, А. Платонава, Дж. Оруэла да грамадскай сістэмы, якая ўвасабляе насілле над чалавекам, яго духоўным светам. Антыутапічныя творы мастакоў (антыутапічныя не па

фармальных прыкметах, а па змесце: прынцыпах вобразнага мыслення і трактоўкі характараў) прызваны бескампрамісна агаліць праблемы міжіндывідуальных зносін, страты чалавекам духоўных асноў свету. Увасобіўшы ў мастацкіх творах асобасныя адносіны індывідума са светам, пісьменнікі актуалізавалі пытанні сацыяльнага і экзістэнцыяльнага, выявілі іх дыялектычнае ўзаемадзеянне.

### Літаратура


1. Мрый, А. Записки Самсона Самасуя / А. Мрый // Творы: Раман, апавяданні, нататкі / А. Мрый ; Уклад. і прадм. Я. Лецкі. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 317 с.

2. Платонов, А. Избранное (Чевенгур. Котлован. Ювенильное море. Усомнившийся Макар. Неизвестный цветок) / А. Платонов. – Минск, «Университетское», 1989. – 574 с.

3. Оруэлл, Дж. «1984» и эссе разных лет / Дж. Оруэлл. Пер. с англ. / Сост. В.С. Муравьев; Предисл. А.М. Зверева; Коммент. В.А. Чаликовой. – М.: Прогресс, 1989. – 384 с.



*В.В. Ткачук (Брэст)*


## ПСІХАЛАГІЗМ ЯК ПРЫНЦЫП СТВАРЭННЯ МАСТАЦКАГА ХАРАКТАРУ (на прыкладзе творчасці А. Жука)

Псіхалагізм і мастацкі характар – літаратурна-этычныя катэгорыі, якія з'яўляюцца метадалагічным інструментарыем і спосабам спасціжэння структуры і свету мастацкага твора. Гэтыя катэгорыі непасрэдным чынам узаемазвязаны: псіхалагізм выступае ў якасці сродку стварэння і індывідуалізацыі мастацкага вобраза. Пры дапамозе такога прыёму ствараюцца разгорнутыя, глыбокія, дакладныя, шматгранныя і своеасаблівыя мастацкія характары. Псіхалагізм як спосаб стварэння вобраза дае аўтару магчымасць адлюстраваць усе бакі жыцця герояў, рэчаіснасць, рухі душы, растлумачыць думкі, пачуцці і паводзіны персанажаў.

Асноўным аб'ектам мастацкай літаратуры з'яўляецца чалавек, яго ўнутраны свет, перажыванні, погляды, разважанні і г. д. Мастацкае даследаванне асобы чалавека раскрывае шматлікія таямніцы яго душы. Найбольш дакладным і універсальным спосабам спасціжэння характару чалавека з'яўляецца псіхалагічны аналіз.

Сучаснае літаратуразнаўства карыстаецца паняццем «псіхалагізм», пад якім разумеюць глыбокае, праніклівае і дэталёвае апісанне пісьменнікам унутранага свету сваіх герояў праз адлюстраванне іх думак, перажыванняў, сноў, а таксама праз знешні выгляд: твар, усмешку, жэсты і інш. Калі ў творы рэалізуюцца такія падыходы, то ёсць падставы гаварыць пра «псіхалагізм» як прыкмету стылю пісьменніка. Залатухіна В.Б., аўтар манаграфіі «Эволюция психологизма Г. Гессе», адзначае, што «многія даследчыкі часта выкарыстоўваюць гэты тэрмін у працах агульнага і прыкладнога характару, аднак яго сэнсавыя значэнні пры гэтым нярэдка з'яўляюцца амаль што палярнымі. Разам з тым, мастацкі псіхалагізм – адна з найбольш складаных катэгорый, якія знаходзяцца пад увагай вучоных: яго спецыфіка і шмата-